**Шаура Р.Ф.,** *дацэнт*

# НАРОДНЫ ЖЫВАПІС: ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ

Народны жывапіс як адзін з распаўсюджаных відаў народнага мастацтва мае свой пачатак у глыбокай старажытнасці. Яшчэ на ранняй стадыі развіцця грамадства жывапіс, графіка з'яўляліся неад'емнай часткай яго духоўнага жыцця. Наскальныя роспісы, малюнкі, што захаваліся да нашага часу, гавораць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не толькі аб значным месцы мастацтва ў духоўнай і ідэалагічнай сферы жыцця нашых продкаў, але і сведчаць аб высокім мастацкім майстэрстве безымянных выканаўцаў. Кампазіцыйная структура, зместавы бок малюнкаў гавораць нам аб тым, што мастацтва народаў, якія жылі ў далёкім мінулым, станавілася важным сродкам у аздабленні іх жылля, выконвала ролю летапіснага адлюстравання найбольш памятных сцэн, сюжэтаў ці з'яў. Ішлі тысячагоддзі, і мастацтва наогул, а жываніс у прыватнасці, паступова набываюць рысы рэлігійна-дагматычнай ідэалогіі і атрымліваюць свае спецыфічныя формы - ікону, насценны роспіс у царквах, саборах, касцёлах. Пазней ікона становіцца адным з галоўных атрыбутаў культавых устаноў, уваходзіць у жыллё і быт сялянства, а таксама ў асяроддзе гарадскога насельніцтва. Яна ў сваёй аснове нясе выразныя рысы пэўнага стылістычнага канона, прадыктаванага ідэйна-змястоўным бокам рэлігійнага і міфалагічнага характару. І як бы ікона ні ўяўлялася ў свядомасці людзей прадметам чагосьці святога, таямнічага, узвышанага, усё ж яна стваралася чалавекам, з'яўлялася вынікам яго думкі і мастацкай творчасці.

Нягледзячы на тое, што кампазіцыйна-схематычная пабудова іконы заўсёды адрознівалася стабільнасцю канонаў, якія залежылі ад змястоўнай яе трактоўкі, усё ж у яе мастацкую структуру траплялі сюжэты і сцэны рэальнага, зямнога жыцця. І часам знікала грань паміж іконай як прадметам культавай прыналежнасці і жывапіснай карцінай, выкананай таленавітым народным жывапісцам. Але ікону як прадмет выяўленчага мастацтва нельга поўнасцю атаясамліваць з народным жывапісам. На яе доўгім гістарычным шляху вядомы шматлікія школы іканапісу. Над стварэннем ікон працавалі выдатныя майстры жывапісу, якія рабілі сапраўдныя шэдэўры выяўленчага мастацтва.

Багатыя і разнабаковыя формы народнага жывапісу можна знайсці ў сферы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Дзе ж рэалізоўваўся жывапісны талент народных майстроў? Перш за ўсё у роспісе куфраў, пралак, калысак, дываноў, маляванак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павозак, саней і г.д. Чалавеку было недастаткова толькі рацыянальнага функцыянавання рэчы, яна павінна была яшчэ і радаваць вока, несці прыгажосць. Усе вышэй памянёныя прадметы хатняга карыстання маляўніча распісваліся раслінным арнаментам, арнаментам з выявамі жывёльнага свету ці змяшчалі тэмы і сюжэты з паданняў і казак, г. зн. утрымлівалі ў сабе элементы вуснага фальклору.

У аздабленні інтэр'ера і экстэр'ера пабудоў, у роспісах прадметаў быту актыўна выкарыстоўваліся сімвалы і знакі, якія неслі пэўны ідэйна-маральны змест. Не было выпадковых элементаў у малюнку, у агульнай кампазіцыйнай пабудове твора. Усё падпарадкоўвалася правілам і законам, якія грунтаваліся на ідэалістычных уяўленнях народа, яго матэрыяльных і духоўных запатрабаваннях.

Найбольш яскрава і выразна праявіўся народны жывапіс менавіта ў роспісе насценных дываноў. На Беларусі, напрыклад, гэты від творчасці характэрны для перыяду XIX і першай паловы XX стагоддзя. У большасці сялянскіх хат (ды і ў гарадскіх кватэрах) тады выкарыстоўваліся маляўнічыя дываны арнаментальнага і сюжэтна-тэматычнага напрамкаў. Гэтыя творы можна было купіць на кірмашы ці заказаць майстру-жывапісцу з улікам густу і пажаданняў самога заказчыка. Неад'емнымі элементамі кампазіцыйнай пабудовы дываноў былі вадаёмы з плаваючымі лебедзямі, закаханыя маладыя пары, экзатычныя звяры, птушкі, казачныя палацы і незлічоная разнастайнасць расліннага свету - кветкі, травы, дрэвы. Адкрытасць і чысціня колеру, выдатная стылізаванасць і дэкаратывізм маляваных прадметаў і дэталей кампазіцыі, гранічная інфарматыўнасць, фальклорная апавядальнасць сюжэта не толькі надавалі твору знешне эстэтычную прывабнасць, але і рабілі яго прадметам міфалагічна-філасофскага гучання. Мастак паказваў жыццё ў большай ступені ідэалізаваным, чым рэальна-прагнастычным, больш зачараваным і прыгожым, чым звычайным, часам нават трагічным. Маляваныя дываны неслі людзям радасць зямнога жыцця, раскрывалі вечную прыгажосць прыроды, абуджалі лепшыя чалавечыя пачуцці, усялялі веру ў дабрыню і надзею ў асабістае шчасце.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастакоў з народа, як прынята было іх тады называць, шмат працавала на Беларусі. Бадай што ў кожным раёне былі свае майстры, якія стваралі маляваныя дываны, скацеркі, макаткі і іншыя рэчы хатняга ўжытку. Такі мастацкі «тавар» знаходзіў патрэбу і збыт, што і дыктавала яго развіццё. На жаль, гісторыя амаль што не захавала імён выдатных творцаў, якія сваім мастацтвам узбагачалі і ўпрыгожвалі зямное, чалавечае жыццё. Дзякуючы нашым навукоўцам, даследчыкам, мастакам сёння нам у поўнай меры адкрыта творчасць беларускай мастачкі - «прымітывісткі»Алены Кіш, якая працавала ў 30-я і 40-я гады XX стагоддзя. Дзевяць палотнаў гэтага сапраўды геніяльнага майстра, якія знаходзяцца ў Заслаўскім музеі-запаведніку, маюць вялікую нацыянальную каштоўнасць. Але мы можам ганарыцца і тым, што і сёння ёсць паслядоўнікі гэтых традыцый народнага жывапісу. Такія майстры, як Васіль Жарнасек, Міхась Засінец, Вольга Лапіцкая, Фёдар Дудо і іншыя, упісалі новую старонку ў народнае мастацтва нашай рэспубліцы. Цяга да прыгожага, прага стварыць гэтае прыгожае сваімі рукамі былі і заўсёды застануцца надзённай патрэбнасцю ў жыцці нашага народа. А гэта значыць, што не перапыніцца сувязь пакаленняў, не зкікнуць тыя традыцыі, на якіх грунтуецца духоўная культура беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ